# Пралеска

ДАШКОЛЬНАЕ ВЫХАВАННЕ
N 4 (33), красавік, 1994
Штомесячны навукова-метадычны
ілюстраваны часопіс
Выходзіць са жніўня
1991 года
Заснавальнік:
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь

**1** Алесь САЧАНКА. Хлусня-манюка
**3** Дашкольнае выхаванне сёння. А заўтра?
**5** Людміла САЛАМАХА. Зона суму
**6** Алесь САЧАНКА. Радыяцыя: псіхалагічны аспект
**8** Віктар ФІЛІПЧЫК. Каб не страціць святое...
**9** Алесь МАРЦІНОВІЧ. Ля берага вечнасці
**10** І доўжыцца цуд
Людміла ШАРГАЕВА. А я пеўніка ўратую
**12** Алена МЕЛЬНІК. Крытычны перыяд дзяцінства
**13** Алена АФАНАСЬЕВА. Гаворым па-французску. Лексічны раздзел
**17** Арганізацыя работы гуртка па мастацка-маўленчай дзейнасці
**20** Яўгенія ФЕДАРОВІЧ. Нестандартнае абсталяванне для фізкультурнай залы
**21** Музычна-мастацкая дзейнасць у дзіцячым садзе
**25** Валянцін ЛУКША. Мядзведзь і камар
**29** Мастацтва і мастацка-практычная дзейнасць
**35** Вера КАПРАНАВА. Ліцэй: учора і сёння
**37** Надзея КУШНІР. Дыягностыка і карэкцыя псіхалагічных цяжкасцей старэйшых дашкольнікаў
**40** Васіль СКІДАН. Сватанне
**42** Літаратура, якая вам дапаможа
**44** Якаў КАЛАМІНСКІ. Развіццё псіхікі дзіцяці
**45** Гэта цікава
**46** Алесь БАДАК. На казачнай зямлі
**47** Слоўнік нумара
**48** Вы прасілі адказаць. Меню малыша
**49** Смачна есці!
З куфэрка Таццяны
Імя твае і мае
**50** Барыс БОЛАТАЎ. Даступны спосаб пазбавіцца ад радыяцыі
**52** Нотны аркуш
**53** Уладзімір ЮРЭВІЧ. Пацалунак асвы

**Галоўны рэдактар**
А. І. САЧАНКА

**Рэдакцыйная калегія:**
Г. А. БУТРЫМ, П. Ф. ВАСЮЧЭНКА, Л. В. ЗАБАЛОЦКАЯ, В. К. ЗУБОВІЧ, Т. М. КАРАСЦЯЛЁВА, Я. Л. КАЛАМІНСКІ, А. І. КАРПОВІЧ, Г. І. КАШЭЎНІКАВА, Л. І. ЯКУБОЎСКАЯ

А. П. Васючэнка
(тэхнічны рэдактар)
Л. П. Жыткавец
(карэктар)
М. М. Будчанін
(фотакарэспандэнт)

**Адрас рэдакцыі :**
220104, Мінск,
вул. Матусевіча, 36, к. 2,
тэлефон 55-28-94

Выдавецтва "ПОЛЫМЯ"

© "Пралеска", 1994

Пераносы некаторых слоў зроблены не па правілах граматыкі, а паводле магчымасцей камп'ютэра.

Падп. да друку з арыгінал-макета 25.04. 94. Фармат 60х84 1/8. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 6,5. Ум. фарб.-адбіт. 11. Ул.-выд. арк. 8,6. Наклад 21046 паасобнікаў. Зак. 275. Друкарня выдавецтва "Беларускі Дом друку". 220013, Мінск, праспект Францыска Скарыны, 79.

Пробныя адбіткі з фотаформ, выррабленых Беларускім Домам друку, атрыманы рэдакцыяй 11. 04. 94.

ДА ВЕДАМА АЎТАРАЎ!
За дакладнасць прыведзеных у публікацыях фактаў і цытат адказнасць нясуць аўтары.
Рэдакцыя можа друкаваць поўныя матэрыялы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара .
Просім у сваіх допісах паведамляць свой дакладны адрас, тэлефон, прозвішча, імя і імя па бацьку. Рэдакцыя прымае для разгляду рукапісы аб'ёмам не больш як 10 старонак, надрукаваныя праз два інтэрвалы на машынцы у двух экземплярах, не ўступаючы у перапіску з аўтарамі.

ПСІХАЛАГІЧНЫ ПРАКТЫКУМ



*Якаў 'КАЛАМІНСКІ*

# РАЗВІЦЦЁ ПСІХІКІ ДЗІЦЯЦІ

*(Працяг. Пачатак у №№ 1-3)*

## СЕНЗІТЫЎНЫЯ ПЕРЫЯДЫ РАЗВІЦЦЯ

Чаму нельга стаць добрым фігурыстам або артыстам балета, калі не пачаць абучэння з дашкольнага дзяцінства? Чаму двухгадовае дзіця лёгка засвойвае любую мову, а людзі больш сталыя пасля некалькіх гадоў штудзіравання замежнай мовы не могуць бліснуць свабодным яе валоданнем?

Уся справа ў тым, што псіхалагічнае развіццё не працякае плаўна і раўнамерна. У пэўныя перыяды жыцця чалавек асабліва адчувальны да пэўных педагагічных уздзеянняў, або, як гавораць псіхолагі, *сензітыўны* да іх. Напрыклад, у другі і трэці гады жыцця чалавек маланкава авалодвае мовай менавіта таму, што ў гэты перыяд ён сензітыўны да лінгвістычных з'яў. Якіх поспехаў маглі б дасягнуць людзі, калі б вучоныя разгадалі тайну асноўных сензітыўных перыядаў, калі б бацькі і педагогі дакладна ведалі, калі і чаму трэба вучыць! Але гэта справа будучага, а пакуль нярэдка ўпускаецца залаты час і магчымасці да творчага развіцця не рэалізуюцца. Адбываецца тое, што вучоныя абазначылі страшнаватым тэрмінам — НЗМЭРЗ — незваротнае згасанне магчымасцей эфектыўнага развіцця здольнасцей. Незваротнае — вось што жахліва.

Не выключана, што ў недалёкім будучым узнікне асобая галіна педагогікі — эмбрыянальная педагогіка — навука аб прамым і ўскосным (праз псіхіку і арганізм маці) уздзеянні на фарміраванне псіхікі чалавека ў перыяд яго эмбрыянальнага развіцця.

Не выключана, што незвычайная дзейснасць навучання, хуткасць і трываласць засваення і імклівасць тэмпаў развіцця ў сензітыўныя, крытычныя перыяды маюць агульныя біялагічныя механізмы з дзіўнай з'явай маланкавага абучэння ў жывёл, якая атрымала назву "імпрынцінг" — запамінанне. Выяўлена яна нямецкім біёлагам Д. Хейнротам, які назіраў за паводзінамі інкубатарных гусянят. Ён пасадзіў гусянят, якія нядаўна вылупіліся, да дарослай гускі, чакаючы, што яны пойдуць за ёй (зразумела, гужам!). Якое ж было яго здзіўленне, калі гусяняты пайшлі не за гускай, а за ім самім, пайшлі (гужам), не адстаючы ад яго ні на крок!

Пазней гэты факт быў шматразова ўзноўлены і правераны многімі даследчыкамі. Асабліва ўражваюць доследы К. Лорэнца. Ёсць фатаграфіі: наперадзе ідзе Лорэнц, а за ім — паслухмяны вывадак; эрзацмаці ўваходзіць у ваду, плыве — прыёмышы за ім. Аказваецца, у першыя мінуты жыцця маладой жывёліны ў яе памяці незабыўна адбіваецца вобраз першага трапіўшага на вочы рухомага прадмета, і за гэтым прадметам з гэтага часу дзіцяня будзе паўсюль існі. Не мае значэння, ці гэта чалавек, ці гуска, ці мяч, падушка, кораб — галоўнае, каб аб'ект (ён атрымаў назву "імпрынцінг-аб'ект") рухаўся. І гэта першае ўражанне, якое ўжо немагчыма сцерці. Яно на ўсё жыццё! Ці не тут разгадка моцы першых уражанняў?

Пераносіць з'явы, выяўленыя ў доследах над жывёламі, на чалавека вельмі небяспечна. Але цяжка ўтрымацца. Вядомы савецкі генетык акадэмік Б. Л. Аставураў лічыць, што і ў чалавека некаторыя ўласцівасці псіхікі ў парадку так званага імпрынцінга, або запамінання, узнікаюць у першыя дні, месяцы і гады пасля нараджэння і замацоўваюцца на ўсё жыццё. З яго пункту гледжання, існуюць даныя і меркаванні, што менавіта гэты механізм дзейнічае ў той крытычны перыяд, калі чалавек сензітыўны да кахання. І вось ідэальны вобраз адзінай ці адзінага каханага запамінаецца і цалкам авалодвае свядомасцю (каханне з першага позірку і на ўсё жыццё).

Так гінуць сусветныя загадкі. І ў паводзінах пушкінскай Таццяны цяпер усё ясна: прыйшоў сензітыўны для кахання момант: "Час надышоў — яна кахала". Каго? Першага трапіўшага на вочы "імпрынцінга-аб'екта". Ім якраз і аказаўся Яўгеній Анегін: "Як ты ўвайшоў, я ўраз пазнала, пачырванела і сказала сама сабе я: гэта ён!" Класічна дакладнае апісанне імгненнага запамінання!

О, каб існаваў СЕНЗІТАМЕТР! Людзі б дакладна ведалі не толькі тое, калі і чаму вучыць, але і маглі б прагназіраваць той небяспечны момант, калі лепш наогул не выходзіць з дому і глядзець толькі на вартыя імпрынцінга, г. зн. першага кахання, аб'екты. А можа, лепш не трэба такой запраграміраванасці?

## Роля спадчыннасці, асяроддзя і выхавання ў развіцці псіхікі дзіцяці

"І ўсё ж супраць прыроды не пойдзеш. Якім нарадзіўся, такім і будзе... Яблычак ад яблыні недалёка коціцца". — "Казкі гэта. Ад настаўнікаў усё залежыць". — "А я думаю — ад кампаніі: з кім павядзецца, ад таго і набярэцца!"

Напэўна, кожнаму даводзілася чуць падобныя выказванні. На самай

справе, чаму ўсё-такі людзі, якія нараджаюцца на першы погляд зусім падобнымі, з цягам часу становяцца такімі рознымі? Як спалучаюцца ў барацьбе за будучага чалавека тры знакамітыя кіты — спадчыннасць, асяроддзе і выхаванне?

Пачнём з уплыву *спадчыннасці*. Мы ўжо ведаем, што чалавек — істота адначасова і біялагічная, і сацыяльная. Але як ужываюцца, узаемадзейнічаюць у канкрэтнай асобе гэтыя два пачаткі? Пытанне вельмі складанае. Нездарма адзін псіхолаг скардзіўся: калі ён чуе, быццам чалавек — істота біясацыяльная, яму ўяўляецца кашмарная пачвара, нешта накшталт кентаўра: галава чалавечая, тулава конскае або львінае, як у сфінкса. У загадку гэтай дваістасці імкнуцца пранікнуць легіёны вучоных ужо сотні гадоў.

Перш за ўсё важна адзначыць, што савецкая псіхалогія і педагогіка адмаўляюць тую тэорыю спадчыннасці, згодна з якой усе рысы асобы чалавека, яго маральнае аблічча і здольнасці прадвызначаны генамі, атрыманымі ад продкаў. Будзе чалавек добрым або злым, смелым або баязлівым, працавітым або гультаём — усё па гэтай тэорыі загадзя праграміруецца спадчыннымі задаткамі. Гэта вельмі шкодная тэорыя. Перш за ўсё, яна нярэдка ўяўляе сабой шырму для тых, хто не хоча ці не ўмее выхоўваць іншых і самога сябе: усе недахопы спісваюцца спасылкай на "дурную спадчыннасць", супраць якой чалавек бяссільны. Часам нават дзеці непрыметна для навакольных засвойваюць "тэорыю спадчыннасці":

— Не, Марыя Іванаўна, — гаворыць пяцікласніца настаўніцы, — вы ўжо не старайцеся навучыць мяне матэматыцы: мая маці матэматыку не разумела, сястра старэйшая па гэтаму прадмету двойкі атрымлівала. Няздольныя мы да матэматыкі!

Тэорыя спадчыннасці шкодная і ў палітычных адносінах: яна абвяшчае "прыродную" няроўнасць здольнасцей людзей розных рас і нацыянальнасцей. Расісты, напрыклад, лічаць, што прадстаўнікі белай расы валодаюць добрай спадчыннасцю, а чарнаскурыя — дрэннай. Адсюль першыя павінны панаваць над другімі. І жыццё, і педагагічны вопыт, і навука пераканаўча абвяргаюць гэтыя выдумкі. Да якой бы расы ці нацыянальнасці ні належала дзіця, яно можа пры адпаведных умовах дасягнуць высокага ўзроўню развіцця. У псіхалагічнай літаратуры апісваецца такі характэрны выпадак.

Экспедыцыя французскага вучонага Ж. Веляра знайшла ў вёсачцы, згубленай у глыбіні лясоў Цэнтральнай Амерыкі, пакінутую на волю лёсу маленькую дзяўчынку, якую пазней назвалі Мары Івон. Яна адносілася да племені гваякілаў — самага адсталага на зямным шары. Дзяўчынку прывезлі ў Парыж, аддалі ў школу, у выніку яна ператварылася ў інтэлігентную і культурную жанчыну.

Вялікая роля спадчыннасці перш за ўсё ў тым, што мы ў спадчыну атрымліваем чалавечы арганізм, чалавечую нервовую сістэму, чалавечы мозг і органы пачуццяў.

А можа, калі ў жывой істоты высокаарганізаваны мозг, чалавечыя ўмовы жыцця і самаахвярныя і ўмелыя выхавальнікі, яна можа стаць чалавекам, хаця нарадзілася шымпанзэ? Нямала вучоных імкнуліся адказаць на гэта пытанне. Н. М. Ладыгіна-Котс гадавала маленькага шымпанзэ Іоні з паўтара да чатырох гадоў у сваёй сям'і. Дзіцянё карысталася поўнай свабодай. У яго распараджэнні былі самыя розныя рэчы, цацкі — усё, што акружае чалавечае дзіця. Яго прыёмная маці ўсяляк імкнулася навучыць яго чалавечым дзеянням, і асабліва маўленню. Усе асаблівасці яго паводзін яна фіксавала ў дзённіку. А праз дзесяць гадоў даследчыца правяла акурат такія ж назіранні за ўласным сынам. Так узнікла кніга "Дзіця шымпанзэ і дзіця чалавека ў іх інстынктах, эмоцыях, гульнях, прывычках і выразных рухах". У развіцці абодвух малых выявілася шмат агульнага, перш за ўсё ў гульнях і эмацыянальных праяўленнях. Але непараўнальна больш аказалася адрозненняў: Іоні так і не авалодаў вертыкальнай паходкай, не змог навучыцца членараздзельнаму маўленню і працоўным дзеянням. Такія ж вынікі атрымалі і іншыя даследчыкі.

Як адзначае Я. Дэмбоўскі, рана ці позна кожны выхоўваемы шымпанзэ павінен закончыць свой век у клетцы, зачыненай на моцны і нялёгка адчыняемы замок.

*(Працяг будзе)*

## ГЭТА ЦІКАВА

### ХТО ЯК СПІЦЬ

Амерыканскі псіхіятр Сэмуэл Дэнел зрабіў цікавыя назіранні. Тыя, хто спіць "абаранкам", — гэта людзі, якія падсвядома не жадаюць расставацца з дзяцінствам. Яны адчуваюць патрэбу ў апекуне з моцным характарам. Пазбягаюць адказнасці і нараўне падпадаюць пад добры і дрэнны ўплыў.

Тыя, хто спіць на жываце, падагнуўшы нагу, звычайна ўпэўнены ў сабе, пунктуальныя, паслядоўныя ў разважаннях, любяць парадак. Не церпяць нечаканасцей, разважлівыя, прадбачлівыя. Любяць навязваць сваё меркаванне, камандаваць.

Тыя, хто спіць на спіне, заклаўшы рукі за галаву, таварыскія, сардэчныя, добрыя. Яны ведаюць пра свае недахопы, але лічаць за лепшае не думаць пра іх і не змагацца з імі. Гэта людзі светлага розуму, яны па-сяброўску ставяцца да акружаючых і прымаюць свет і людзей такімі, якія яны ёсць, што ў немалой ступені абумоўлена жаданнем не ўскладняць сабе жыццё. З такімі людзьмі лёгка ўступаць у зносіны. Іх можна назваць яшчэ улюбёнцамі лёсу.

Тыя, што спяць на баку, злёгку падагнуўшы калені, — людзі ўраўнаважаныя, памяркоўныя, схільныя да цвярозых развážанняў і разумных кампрамісаў. Яны могуць прыстасоўвацца да розных жыццёвых умоў, да бытавых нягод. Аднак яны недастаткова смелыя, энергічныя і настойлівыя ў дасягненні мэты, не прагныя да славы, не імкнуцца да лідэрства. Лічаць за лепшае заставацца ў цяню, асабліва калі гэта цень паважаемага імі чалавека.

Такім чынам, скажы мне, як ты спіш, і я скажу — хто ты.

### ЗА ПРАВА НА ЎСЫНАЎЛЕННЕ

Вядомая італьянская актрыса Даліла дзі Ладзара выйграла першы раунд у працяглай барацьбе з дзяржаўнай бюракратыяй за права ўсынавіць дзіця. Апеляцыйны суд Рыма прызнаў яе прэтэнзіі на ўсынаўленне абгрунтаванымі і ліквідаваў адмоўнае рашэнне суда першай інстанцыі. Зрэшты, гісторыя гэтая яшчэ далёкая ад свайго завяршэння, паколькі канчатковы вердыкт мае права вынесці толькі канстытуцыйны суд Італіі.

Сутнасць справы ў тым, што чароўная актрыса, якая даўно заваявала сэрцы мільёнаў італьянцаў, не замужам. Менавіта адсутнасць пасведчання аб шлюбе і з'яўляецца па італьянскіх законах непераадольнай перашкодай для грамадзяніна, які вырашыў замяніць сіраце бацькоў. Аднак юрыдычныя перашкоды не здольныя спыніць Далілу, якая два гады назад пасля нечаканай смерці свайго маленькага сына Крысціяна вырашыла стаць прыёмнай маці для якога-небудзь пакінутага бацькамі малыша. З таго часу яна вядзе бескампрамісную барацьбу з італьянскай фемідай.

*(Па матэрыялах друку)*